Партыйныя камітэты аналізавалі перадавы прапагандысцкі вопыт на сходах актыву, пасяджэннях аддзелаў прапаганды і агітацыі, метадычных саветах і саветах па эканамічнай адукацыі. Яны прымянялі розныя формы кантролю за работай прапагандыстаў эканамічнага ўсенавуча.

Працоўныя рэспублікі імкнуліся выкарыстаць веды, набытыя ў сістэме эканамічнай адукацыі, у практычнай дзейнасці сваіх калектываў. Вялікая роля ў дасягненні працоўных поспехаў, актывізацыі слухачоў належыць прапагандыстам. Толькі ўдзельнічаючы ў руху «Прапагандыст — пяцігодцы эфектыўнасці і якасці», прапагандысты Гродзенскай вобласці ў 1979/80 навучальным годзе аказалі дзейсную дапамогу слухачам у распрацоўцы больш 90 тысяч сацыялістычных абавязацельстваў і асабістых творчых планаў, каля 50 тысяч асабістых рахункаў эканоміі і беражлівасці, 25 тысяч планаў павышэння вытворчасці працы [10].

У рабоце з прапагандыстамі сістэмы эканамічнай адукацыі ў 70-я гады выявіліся такія недахопы, як захапленне асобных прапагандыстаў асветніцтвам, ігнараванне пытанняў тэорыі, падмена аналіза эканамічнай дзейнасці працоўных калектываў павярхоўнай інфармацыяй аб ходзе выканання планаў; значны быў адсеў слухачоў-прапагандыстаў з універсітэтаў марксізма-ленінізма, усё яшчэ недастаткова выкарыстоўваліся актыўныя формы заняткаў, тэхнічныя сродкі навучання.

У цэлым жа ў рэспубліцы ў гэтыя гады ўдасканальваўся ўзровень тэарэтычнага і метадычнага майстэрства прапагандыстаў сістэмы эканамічнай адукацыі, паляпшаўся іх якасны склад. Па падліках аўтара, да 1980 года амаль 70 % прапагандыстаў сістэмы эканамічнай адукацыі ў прамысловасці рэспублікі былі камуністамі, 73 % мелі вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю, 83 % былі спецыялістамі народнай гаспадаркі [11]. Вопыт падбору і падрыхтоўкі прапагандыстаў правераны практыкай дзесяцігоддзя, паслужыў асновай да далейшага ўдасканалення гэтай работы.

На XXVII з'ездзе КПСС адзначалася, што неабходна перагледзець характар і змест усіх форм навучання ў сістэме эканамічнай адукацыі так, каб кожны работнік «мог кваліфікавана, з веданнем справы падыходзіць да эканамічнай ацэнкі тэхнічных рашэнняў [12]. Важная роля ў перабудове эканамічнай адукацыі належыць прапагандысту. Уяўляецца неабходным, улічваючы вопыт сямідзесятых гадоў, пры перабудове эканамічнай адукацыі больш старанна адбіраць для прапагандысцкай дзейнасці людзей, маючых да гэтага схільнасці, і шырэй выкарыстоўваць універсітэты марксізма-ленінізма для падрыхтоўкі і спецыялізацыі прапагандыстаў, вучыць іх умела прымяняць актыўныя формы заняткаў: дыскусіі, абмен вопытам, дзелавыя гульні, канферэнцыі.

[1] Ленін У. І. Творы. Т. 31. С. 344.
[2] Правда. 1987. 15 апр.
[3] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 47, д. 633, л. 188.
[4] Там жа. Оп. 130, д. 51, л. 19.
[5] Там жа. Оп. 47, д. 625, л. 102, 105.
[6] Там жа. Д. 644, л. 69.
[7] Партархіў Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, оп. 136, д. 12, л. 98, 100, 101.
[8] Партархіў Мінскага АК КПБ. Ф. 69, оп. 12, д. 15, л. 185.
[9] Там жа. Оп. 11, д. 6, л. 142.
[10] Партархіў Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, оп. 84, д. 84, л. 39.
[11] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 133, д. 48, л. 44, 65, 66, 85, 86, 100, 101, 116, 117, 118, 144, 145, 146.
[12] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск, 1986. С. 306—307.

А. А. ГЕРАСІМОВІЧ

## З ВОПЫТУ РАБОТЫ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧАГА КЛАСА НА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ХІМІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў 70-я ГАДЫ

Састаўной часткай дзейнасці КПСС, накіраванай на павышэнне ролі рабочага класа ў ажыццяўленні праграмы інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, з'яўляецца актывізацыя намаганняў работнікаў хімічнай прамысловасці ва ўсеўзрастаючай пастаўцы вёсцы мінеральных угнаенняў і сродкаў абароны раслін. Вядома, што ні меліярацыя, ні нават самая высокая

агратэхніка і рацыянальныя севазвароты не дадуць жадаемага выніку, калі вынас пажыўных рэчываў з глебы не будзе аднаўляцца ўнясеннем неабходных доз угнаенняў.

Нягледзячы на поспехі, дасягнутыя да сямідзесятых гадоў хімічнай прамысловасцю краіны, узровень забеспячэння сельскай гаспадаркі мінеральнымі ўгнаеннямі намнога адставаў ад надзённых патрэбнасцей калгасаў і саўгасаў. У даследуемы перыяд Камуністычная партыя і Савецкі ўрад прынялі дзейсныя меры, накіраваныя на павелічэнне вытворчасці мінеральных угнаенняў. Паводле рашэнняў XXIV і XXV з'ездаў КПСС, XXVII і XXVIII з'ездаў Кампартыі Беларусі ў рэспубліцы планавалася да канца дзевятай пяцігодкі павялічыць вытворчасць мінеральных угнаенняў у 1,7 раза, а ў 1980 годзе давесці выпуск угнаенняў да 14,3 млн т. Для выканання гэтых задач неабходна было развіваць далей хімічную прамысловасць, пабудаваць новыя аб'екты, расшырыць і рэканструіраваць дзеючыя прадпрыемствы, мабілізаваць усе рэзервы.

Станоўчую ролю ў паскарэнні тэмпаў будаўніцтва хімічных прадпрыемстваў у Беларусі адыграла пастанова ЦК КПСС ад 4 красавіка 1972 года «Аб патрыятычнай ініцыятыве калектываў Невіннамыскага і Васкрасенскага хімкамбінатаў, горна-хімічнага камбіната «Апатыт», будаўнічых трэстаў «Стаўрапальхімбуд», «Масаблбуд» № 5, «Апатытбуд» і мантажных арганізацый Мінмантажспецбуда СССР»[1]. У пастанове ЦК КПСС была адобрана патрыятычная ініцыятыва калектываў па датэрміноваму ўводу ў дзеянне новых магутнасцей, іх асваенню і звышпланавай вытворчасці ўгнаенняў. Цэнтральны Камітэт ацаніў гэты пачын як праяўленне клопатаў рабочага класа аб узмацненні дапамогі працаўнікам вёскі ў выкананні рашэнняў XXIV з'езда партыі.

У адказ на пастанову ЦК КПСС працоўныя калектывы камбіната «Беларускалій», Гродзенскага хімічнага камбіната, Гомельскага хімічнага завода, будаўнічых трэстаў № 3, 10, 11 Мінпрамбуда БССР пераглядзелі свае сацыялістычныя абавязацельствы і вырашылі на аснове паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, прыцягнення ў вытворчасць унутраных рэзерваў датэрмінова ўвесці ў дзеянне новыя магутнасці, скараціць тэрміны іх асваення і выпусціць звыш плана ў 1972—1975 гадах 160 тыс. т калійных, 120 тыс. т фосфарных і 215 тыс. т азотных угнаенняў. У маі 1972 года ЦК Кампартыі Беларусі падтрымаў гэту ініцыятыву калектываў [2].

Ажыццяўляючы кіраўніцтва будаўніцтвам аб'ектаў, закліканых працаваць на хімізацыю сельскай гаспадаркі, абкомы, гаркомы КПБ, пярвічныя партарганізацыі творча вырашалі пытанні арганізацыйна-партыйнай і палітыка-масавай работы, шукалі найбольш эфектыўныя формы мабілізацыі працоўных на датэрміновае выкананне ўрадавых заданняў. Для аператыўнага вырашэння пытанняў будаўніцтва па ініцыятыве партыйных арганізацый непасрэдна на будоўлях ствараліся штабы ў складзе прадстаўнікоў трэстаў, камбінатаў і субпадрадных арганізацый. За асобнымі ўчасткамі замацоўваліся камуністы.

Так, напрыклад, для наладжвання больш цеснага супрацоўніцтва ўдзельнікаў будаўніцтва Чацвёртага Салігорскага калійнага завода, забеспячэння адзінства партыйнага кіраўніцтва і кантролю за ходам усяго комплексу работ у 1976 годзе быў створаны савет сакратароў пярвічных і цэхавых партарганізацый, а ў 1978 годзе партком будоўлі [3]. Была перагледжана структура партыйных арганізацый будаўнічых упраўленняў, зроблена перастаноўка камуністаў на ўчастках, у брыгадах з такім разлікам, каб на кожным з іх былі члены партыі. Да 1978 года ў 52 брыгадах, 10 участках, якія будавалі калійны завод, было створана 17 партыйных, 5 партыйна-камсамольскіх груп, зацверджана 40 партарганізатараў [4].

У мэтах павышэння працоўнай актыўнасці рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, якія ўдзельнічалі ў будаўніцтве калійнага завода, быў зацверджаны нагрудны знак «Ударніку Чацвёртага Салігорскага калійнага завода». Па ініцыятыве парткома на будаўніцтве знайшло прапіску сацыялістычнае спаборніцтва па прынцыпу «рабочай эстафеты»: «Ад узаемных прэтэнзій—да ўзаемнай дапамогі і падтрымкі», брыгадны падрад (у красавіку 1976 года па метаду Н. А. Злобіна працавала 11 з 42 брыгад)[5] і г. д.

Шмат цікавых форм партыйнай работы па мабілізацыі рабочых на датэрміновы ўвод аб'ектаў тукавай прамысловасці ў 1971—1980 гады накапілі Гродзенскі, Гомельскі абкомы і гаркомы КПБ, партыйныя арганізацыі Гродзенскага вытворчага аб'яднання «Азот» імя С. О. Прытыцкага,

Гомельскага хімічнага завода імя 50-годдзя СССР. Напрыклад, на збудаванні аб'ектаў у Гродзенскім аб'яднанні «Азот» у мэтах узмацнення арганізацыйна-палітычнай работы, мабілізацыі калектыва будаўнікоў на забеспячэнне своечасовага ўводу аб'ектаў была створана аператыўная група гаркома КПБ. Яна пастаянна трымала гарком у курсе спраў на будоўлі. З ліку камуністаў, камандзіраваных для ўдзелу ў будаўніцтве, ствараліся часовыя партыйныя групы.

Варта адзначыць, што за 1971—1975 гады ў рэспубліцы былі ўведзены ў дзеянне і асвоены магутнасці па вытворчасці 2131 тыс. т мінеральных угнаенняў. Гэта дазволіла забяспечыць павелічэнне выпуску ўгнаенняў у 1,8 раза замест прадугледжанага Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС задання па росту іх вытворчасці ў 1,7 раза [6]. А за 1976—1979 гады ўведзены новыя магутнасці па вытворчасці 726 тыс. т угнаенняў у Гродзенскім аб'яднанні «Азот», 2400 тыс. т у аб'яднанні «Беларускалій»[7].

Разам з работай па павелічэнню магутнасцей прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці партыйныя арганізацыі вялікую ўвагу надавалі пытанням інтэнсіфікацыі вытворчых працэсаў на дзеючых камбінатах і заводах. Кіруючыся рашэннямі ЦК КПСС, ЦК Кампартыі Беларусі, абкомы, гаркомы, райкомы КПБ клапаціліся перш за ўсё аб павышэнні баявітасці пярвічных партыйных арганізацый, узмацненні іх уплыву на ўсе бакі жыцця працоўнага калектыва. Гэтыя пытанні сістэматычна абмяркоўваліся на пасяджэннях бюро, ім удзялялася вялікая ўвага на нарадах партактываў, канферэнцыях.

У сакавіку 1974 года бюро Гродзенскага абкома партыі абмеркавала пытанне «Аб рабоце парткома Гродзенскага хімічнага камбіната імя С. О. Прытыцкага па кіраўніцтву цэхавымі партыйнымі арганізацыямі і партыйнымі групамі ў святле патрабаванняў XXIV з'езда КПСС». Адзначыўшы станоўчыя бакі ў дзейнасці парткома, бюро ў той жа час звярнула ўвагу на тое, што партком не забяспечыў пастаянны партыйны ўплыў на ўсіх важнейшых участках вытворчасці, указала на недахопы ў рабоце па адбору лепшых рабочых для прыёма ў партыю [8].

Рашэнні абласнога камітэта былі разгледжаны ў красавіку 1974 года на партыйным сходзе камбіната, абмяркоўваліся ў цэхавых партыйных арганізацыях і партгрупах. У паўсядзённай рабоце партком стаў удзяляць вялікую ўвагу ўзмацненню ўплыву камуністаў на справы сваіх калектываў. Значная работа праводзілася па ўдасканаленню структуры цэхавых партыйных арганізацый, рацыянальнай расстаноўцы камуністаў на рашаючых участках вытворчасці. У выніку партыйная арганізацыя хімічнага камбіната за гады дзевятай пяцігодкі павялічылася на 170 чалавек, 90 % камуністаў было занята непасрэдна ў вытворчасці. Партыйная праслойка сярод працуючых павялічылася з 12,4 % у 1974 годзе да 13 % у 1977 годзе [9].

Дзейсную дапамогу і падтрымку аказвалі парткомам, пярвічным партыйным арганізацыям вытворчага аб'яднання «Беларускалій», Гомельскага хімічнага завода ў вырашэнні пытанняў арганізацыйна-партыйнай работы Мінскі і Гомельскі абкомы, Салігорскі і Гомельскі гаркомы КПБ. Аналіз работы Салігорскага гаркома партыі паказвае, што за 1971—1980 гады больш як 10 разоў на бюро ў той ці іншай фармуліроўцы разглядаліся пытанні паляпшэння кіраўніцтва парткомам аб'яднання «Беларускалій» работай партгруп, выхавання маладых камуністаў. Выкананне рашэнняў Салігорскага гаркома КПБ дазволіла да канца 1978 года ўсе асноўныя ўчасткі вытворчасці ў аб'яднанні ўмацаваць партыйнымі кадрамі, а партыйная праслойка сярод абагачальнікаў склала 14,4 %, сярод шахцёраў больш як 15 % [10].

Паўсямеснае ўдасканаленне работы партыйных арганізацый па ўзмацненню авангарднай ролі камуністаў дазволіла павысіць баявітасць пярвічных партарганізацый, актывізаваць іх уплыў на працэс вытворчасці. Вялікую ўвагу партыйныя арганізацыі ўдзялялі развіццю навукова-тэхнічнага прагрэса, павышэнню творчай актыўнасці працоўных, удасканаленню арганізацыі вытворчасці і кіравання, ажыццяўленню мерапрыемстваў па паляпшэнню якасці прадукцыі.

У даследуемы перыяд практычна ўсе прадпрыемствы, якія выпускаюць хімічныя сродкі для сельскай гаспадаркі, супрацоўнічалі з вучонымі навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў. Напрыклад, Гомельскі хімічны завод меў дзелавыя сувязі з 14, вытворчае аб'яднанне «Беларускалій» з 32 інстытутамі [11].

Разам з тым не з усімі НДІ супрацоўніцтва прадпрыемстваў было

плённым. Так, партыйная арганізацыя і адміністрацыя Салігорскага аддзялення Беларускага філіяла НДІІГ не дабілася таго, каб яно стала каардынуючым звяном у арганізацыі ўсіх навукова-даследчыцкіх і доследных работ, праводзімых у аб'яднанні «Беларуськалій». У аддзяленні дапускалася распыленне сродкаў на другарадныя работы, у той час як страты руды ў нетрах складалі 40—50 %.

Вырашаючы такія праблемы, партыйны камітэт Гродзенскага хімкамбіната імя С. О. Прытыцкага абапіраўся на грамадскія арганізацыі: НТТ. ГКБ, ГТБ, ГБЭА, УТВР. На камбінаце, пачынаючы з 1970 года, па прапанове парткома сталі ўкараняцца комплексныя планы рацыяналізатарскай і вынаходніцкай работы. Штогод у мэтах актывізацыі гэтай работы праводзілася чатыры-пяць конкурсаў. У цэхах праходзілі рабочыя сходы, праводзіліся лекцыі і гутаркі на тэхнічныя тэмы; укараненне вынаходстваў і рацпрапаноў асвятлялася ў заводскім друку. Усё гэта садзейнічала павелічэнню колькасці работнікаў, якія займаліся тэхнічнай творчасцю. Калі ў 1972 годзе крыху больш як 80 % інжынерна-тэхнічных работнікаў мелі асабістыя творчыя планы і кожны сёмы працуючы быў рацыяналізатарам, вынаходнікам, то ў 1977 годзе асабістыя творчыя планы мелі 95 % інжынерна-тэхнічных работнікаў, а кожны трэці работнік быў рацыяналізатарам [12]. Эфектыўнасць укаранення рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў па гадах дзесятай пяцігодкі значна перавышае планавую (1 млн рублёў у год) і склала: у 1976 годзе—1299 тыс. рублёў; у 1977—1418 тыс. рублёў; 1978—1122 тыс. рублёў; 1979—1260 тыс. рублёў.

Развіваючы тэхнічную творчасць працоўных, партыйныя арганізацыі сканцэнтроўвалі намаганні наватараў на вырашэнні задач больш поўнага выкарыстання рэзерваў вытворчасці, паскарэння росту прадукцыйнасці працы. Паўсядзённая работа, накіраваная на пошукі ўнутраных рэзерваў інтэнсіфікацыі вытворчасці, была ўласціва парткомам, пярвічным партыйным арганізацыям вытворчага аб'яднання «Беларуськалій», Гомельскага хімічнага завода.

Пры падтрымцы партыйнага камітэта ў вытворчым аб'яднанні «Беларуськалій» шырокае распаўсюджанне атрымаў вядомы пачын вугальшчыкаў краіны па здабычы з ачыснога забою 1000 і больш тон вугалю ў суткі. Першымі на камбінаце падтрымалі гэты патрыятычны пачын калектывы брыгад, якія ўзначальвалі камуністы С. Янчэўскі, В. Шульга і С. Карэнка. У рабочых калектывах адбыліся сустрэчы з ініцыятарамі спаборніцтва. Іх выступленні былі прасякнуты шчырай заклапочанасцю за лёс планаў. Такая работа з людзьмі садзейнічала таму, што ў аб'яднанні ў дзесятай пяцігодцы амаль палавіна брыгад здабывала больш чым тысячу тон руды ў суткі.

Праяўляючы клопаты аб росце выпуску мінеральных угнаенняў для сельскай гаспадаркі, партыйныя арганізацыі выканалі вялікую работу па кіраўніцтву сацыялістычным спаборніцтвам, укараненню шчокінскага метаду і г. д. Вялікая арганізатарская і палітычная работа партыйных, савецкіх, гаспадарчых, прафсаюзных і камсамольскіх органаў, творчая праца рабочых, інжынераў і тэхнікаў дазволілі істотна павялічыць выпуск мінеральных угнаенняў. Вытворчасць іх у Беларускай ССР вырасла з 6120 тыс. т у 1970 годзе да 13822 тыс. т у 1980 годзе [13]. Па аб'ёму вытворчасці тукаў Беларусь выйшла на другое месца ў краіне. Нарошчванне вытворчасці мінеральных угнаенняў дазволіла значна павялічыць іх пастаўкі сельскай гаспадарцы. У 1980 годзе на кожны гектар пашы пастаўлялася (у пераліку на 100 % зместу пажыўных рэчываў) 252,5 кг мінеральных угнаенняў (159,6 кг у 1970 годзе).

Аналіз работы партыйных арганізацый Беларусі ў 70-я гады дазваляе зрабіць вывад, што выконваючы рашэнні з'ездаў КПСС і КПБ, пастановы ЦК КПСС і ЦК КПБ, яны выкарыстоўвалі эфектыўныя формы мабілізацыі рабочых на выкананне планавых заданняў, ажыццяўлялі дзейсны кантроль над будаўніцтвам новых і рэканструкцыяй старых прадпрыемстваў, садзейнічалі павелічэнню вытворчасці хімічных сродкаў для вёскі, а значыць і інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці.

[1] Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам: Сборник документов. М., 1974. Т. 9. С. 29—30.

[2] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 81, д. 2409, л. 16—17.

[3] Гл.: ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 45, оп. 9, д. 4, л. 60—61; оп. 11, д. 6, л. 62.

[4] Там жа. Ф. 45, оп. 11, д. 4, л. 113.

[5] Там жа. Ф. 1, оп. 72, д. 36, л. 138; оп. 74, д. 23, л. 13.

[6] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 81, д. 2662, л. 122.

[7] Звязда. 1980. 9 жніўня.

[8] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, оп. 72, д. 20, л. 9—14.

[9] Там жа. Ф. 2, оп. 45, д. 16, л. 43; ф. 5864, оп. 1, д. 72, л. 7, д. 117, л. 77; д. 100, л. 106.

[10] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 45, оп. 11, д. 6, л. 161.

[11] Гомельская праўда. 1976. 1 кастрычніка; Мінская праўда. 1977. 28 жніўня.

[12] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, оп. 66, д. 12, л. 7; оп. 77; д. 76, л. 9—10.

[13] Народное хозяйство БССР в 1984 г. Минск, 1985. С. 57.

Н. В. ШУЛЬГИНА

# РАБОЧИЙ КЛАСС ГЕРМАНИИ В ПЕРИОД АВСТРО-ПРУССКОЙ ВОЙНЫ 1866 ГОДА

Австро-прусская война 1866 года, хотя и была одной из самых коротких войн прошлого столетия, принадлежит к числу значительных событий в истории Германии: ее исход предопределил объединение страны под прусским главенством в Германскую империю; война явилась серьезной проверкой революционной зрелости немецкого пролетариата.

В 60-х годах в Германии развернулась острая классовая борьба вокруг вопроса о единстве страны. Объективно существовало два пути решения проблемы: путь революционной ломки отживших феодальных порядков, создания буржуазно-демократической республики и путь «династических войн Пруссии, укрепляющих гегемонию прусских помещиков в объединенной Германии»[1]. Для формирующейся немецкой нации, отмечали К. Маркс и Ф. Энгельс, исключительно важное значение имеет то, на какой социально-классовой основе будет достигнуто ее территориально-государственное сплочение. Объединение земель под эгидой Пруссии означало бы засилье юнкерства и военщины, реакцию во внутренней и внешней политике. Достижение государственного единства на буржуазно-демократической основе создало бы условия «для объединения рабочего класса, а объединение рабочих является первой предпосылкой их победы»[2]. Бисмарк, возглавивший в 1862 году прусское правительство, приступил к решению национального вопроса «по-своему, по-юнкерски». Испугавшись новой народной революции, немецкая буржуазия пошла на компромиссную сделку с монархией, с родовитыми крупными помещиками и офицерством, поддержала объединение Германии «сверху». Существовавшие в германских государствах радикально настроенные группировки демократического направления (Вюртембергская народная партия, Немецкая народная партия и др.), несмотря на то что они обладали определенным влиянием среди рабочих, не могли взять руководство общенародной борьбой, поскольку были малочисленны, разрозненны, не имели серьезной программы. В таких условиях только рабочий класс «представлял действительные и правильно понятые интересы всей нации в целом»[3]. Его борьба за демократическую республику стала «важнейшей составной частью общей альтернативной позиции революционного рабочего движения против буржуазии, юнкерства и бонапартистского милитаристского государства»[4].

60-е годы ознаменовались началом нового демократического подъема в германских государствах, формированием пролетарского движения. Но этот процесс был осложнен целым рядом обстоятельств: немецкий пролетариат еще не порвал связи с деревней, большинство его составляли выходцы из непролетарских классов. Эта мелкобуржуазная стихия стала благоприятной почвой для различного рода оппортунистических течений. Буржуазия стремилась не допустить развития рабочего движения по самостоятельному пути и направить его в нужное для себя русло. Национальная раздробленность в условиях сохранения в германских государствах полуабсолютистских порядков, остатков феодальных и полуфеодальных отношений не давала пролетариату возможности сплотить свои силы. Единственной централизованной организацией рабочих был в тот период Всеобщий германский рабочий союз (ВГРС), руководство которого вело «шаткую тактику, приспособляясь к гегемонии юнкера Бисмарка»[5]. Указанными обстоятельствами в значительной мере объясняется отсутствие у немецких рабочих понимания существа национального вопроса и необходимости революционного объединения страны.